**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! БУДЗЬЦЕ АКТЫЎНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая).*

# 22 КРАСАВІКА— ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ У. І. ЛЕНІНА

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1050) ● Чацвер, 18 красавіка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



## Весткі з факультэтаў

Прайшло сумеснае пасяджэнне бюро камітэта камсамола з кафедрай філасофіі, прысвечанае праблемам больш глыбокага вывучэння дыялектычнага матэрыялізму студэнтамі другога курса. У абмеркаванні прынялі ўдзел дацэнт А. В. Клёсава, выкладчык А. Е. Белы, камсоргі В. Мяшчэрская, В. Таляронак, член камсамольскага бюро В. Дудкін.

* * *

На гэтым жа пасяджэнні былі разгледжаны пытанні: «Аб рабоце арганізацыйнага сектара камітэта камсамола факультэта» і «Аб бягучай паспяховасці студэнтаў факультэта ў другім семестры».

## ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»

**Сапраўдным святам камуністычнай працы сталі вясновыя дні напярэдадні 104-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. Студэнты, супрацоўнікі і выкладчыкі універсітэта актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да «чырвонай суботы»—20 красавіка. Калектывы некаторых факультэтаў ужо папрацавалі на будоўлях, добраўпарадкавалі тэрыторыю БДУ і раёна.**

**«Энтузіязм, добрасумленнасць, працавітасць, ініцыятыўнасць» — такі дэвіз камуністаў і камсамольцаў у гэтыя дні.**



## Весткі з факультэтаў

### НА ГЕАФАКУ

**50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя «Асноўныя напрамкі, формы і сродкі камуністычнага выхавання ў сучасных умовах».**

**На канферэнцыі выступілі камсамолец 20-х гадоў, цяпер дацэнт А. С. Акінчыц, член камсамольскага бюро факультэта Людміла Смолій.**

* * *

Студэнты факультэта прынялі актыўны ўдзел ва Усесаюзным камуністычным суботніку. Трэцякурснікі прадаўжалі будаўнічыя работы на геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна» непадалёку ад Валожына, дзе праводзіцца вучэбная практыка географаў. Яны выконвалі розныя віды работ: падвозілі гравій, цэглу, збіралі каменне для фундаментаў. Сіламі трэцякурснікаў у час суботніка было загружана каменнем 58 машын. 20 і 21 красавіка работы на геастанцыі прадоўжыць IV курс.

* * *

З Масквы, Ленінграда, Калінінграда, Уфы, Рыгі, Тарту і іншых гарадоў Савецкага Саюза былі госці на XXXI навуковай канферэнцыі, якая прайшла на факультэце.

**Н. НОВІКАВА.**

**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## ХІМІК— ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОРДА!

«Дзень хіміка!» — гэтыя словы ўвенчвалі велічны корпус хімфака на працягу некалькіх дзён.

А ўнутры — сапраўднае царства гумару, смеху. Калі ўважліва чытаць усе надпісы, аб'явы, рэплікі, разглядаць усе малюнкі, вывешаныя на кожным квадратным метры сцен усіх пяці паверхаў, то можна так і не дайсці да апошняга, а зваліцца дзе-небудзь на паўдарозе ад смеху. Вось аб'ява на дошцы народнага кантролю: «Дадзім 120 працэнтаў наведвання!» Вясёлы народ гэтыя хімікі!

Святочны вечар, які прайшоў у Палацы культуры камвольнага камбіната, таксама «ззяў» гумарам. На ім адбылася знамянальная падзея —

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*

**НА ЗДЫМКУ: госці ў лабараторыі радыяцыйнай хіміі.**

Фота **Д. Чаховіча.**

# УСЕ СРОДКІ—АДЗІНАЙ МЭЦЕ

*ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

Партыйная арганізацыя фізічнага факультэта адна з буйных ва універсітэце. У яе складзе каля 150 камуністаў. Гэта вялікая сіла. Але і задачы, якія стаяць перад ёй, таксама вельмі сур'ёзныя і складаныя. На факультэце толькі дзённым навучаннем ахоплена 1947 юнакоў і дзяўчат. І ўсе намаганні партыйнай арганізацыі падпарадкаваны адзінай мэце — арганізацыі вучэбнага працэсу, атрыманню глыбокіх ведаў кожным студэнтам, а таксама камуністычнаму выхаванню будучых спецыялістаў.

За апошні час партыйная арганізацыя факультэта распрацавала і ўкараніла ў паўсядзённую практыку партыйнай работы шэраг своеасаблівых мерапрыемстваў і сродкаў. Напрыклад, выхаваннем студэнтаў займаюцца не толькі грамадскія арганізацыі, але і ўсе кафедры. І гэта зразумела, бо на кафедрах працуе асноўная частка камуністаў. І каму, як не ім, адначасова з навучаннем весці і выхаваўчую работу.

Партыйнае бюро сістэматычна кантралюе работу кафедр у гэтым кірунку і сістэматычна ставіць іх справаздачы на партыйным бюро або на агульным сходзе. Так, у лістападзе і снежні загадчык кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ прафесар У. В. Ізох і сакратар камсамольскай арганізацыі У. Зяньковіч, загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў прафесар В. Д. Ткачоў і сакратар камсамольскай арганізацыі У. Быкоўскі дакладвалі агульнаму партыйнаму сходу аб іх рабоце па ўцягненню студэнтаў у актыўную навуковую і грамадскую работу. На сходы былі запрошаны камсамольскія актывісты. Атрымалася карысная і дзелавая размова. Супрацоўнікі 14 кафедр пазнаёміліся з вопытам выхаваўчай работы і былі задаволены тым, што камсамольскія бюро кафедр ставяць і своечасова рашаюць важнейшыя пытанні камсамольскага жыцця.

І наогул работа камсамольскіх арганізацый знаходзіцца пад паўсядзённай увагай партыйнай арганізацыі і яе сакратара П. Л. Салава. Акрамя таго, што за дзейнасцю курсавых камсамольскіх арганізацый сочаць члены партыйнага бюро І. П. Зяцькоў, А. М. Саржэўскі, Н. М. Хаўратовіч, М. В. Прылепка і іншыя, партыйная арганізацыя сістэматычна абагульняе перадавы вопыт камсамольскай работы, выяўляе і ліквідуе недахопы. У гэтым сэнсе вельмі цікавым быў адкрыты партыйны сход, які адбыўся ў лютым. На сход былі запрошаны сакратары камсамольскіх арганізацый і члены камсамольскіх бюро патокаў і групкамсоргі. У рабоце партыйнага сходу прыняла ўдзел сакратар парткома універсітэта Т. Я. Дударава.

На абмеркаванне было ўнесена адно пытанне: вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі і задачы на другі семестр. Справаздачу трымалі сакратары камсамольскіх бюро патокаў першага курса П. Цэдрык, М. Нічыпаровіч і Г. Грыцук. Камсамольскія важакі гаварылі аб тым, што імі зроблена і робіцца, каб забяспечыць паспяховасць усіх студэнтаў, аб тым, што іх хвалюе і непакоіць. Прычым у ходзе падрыхтоўкі партыйнага сходу камуністы А. Саржэўскі, В. Ткачэнка больш тыдня вывучалі работу камсамольскіх арганізацый і аказалі камсамольскім бюро вялікую дапамогу ў наладжванні камсамольскай работы. Яна была тым больш патрэбнай, што першакурснікі трымалі сваю першую справаздачу.

У абмеркаванні выступленняў камсамольскіх важакоў прынялі ўдзел каля 10 чалавек. Было адзначана, што дзякуючы паўсядзённай увазе партыйнага бюро, якое ўвесь час накіроўвала работу камсамольскіх арганізацый, першакурснікі здалі першую сесію значна лепш, чым у мінулыя гады. У прынятым рашэнні падагульнен вопыт камсамольскай работы і намечаны шляхі, як ісці далей, каб замацаваць дасягнуты поспех.

Партыйнае бюро факультэта выкарыстоўвае ўсе формы грамадска-палітычнай работы са студэнтамі. Вялікая ўвага, у прыватнасці, удзяляецца рабоце куратараў, каб зрабіць іх выхавацелямі студэнтаў, метадыстамі ў арганізацыі вучэбнага працэсу непасрэдна ў групе. Куратары сістэматычна інструктуюцца. Іх работа знаходзіцца пад увагай дэканата і прафкома факультэта. Некалькі разоў у год партыйнае бюро знаходзіць пэўную форму прапаганды вопыту куратараў. На гэты раз такой формай быў адкрыты партыйны сход. З паведамленнямі аб сваіх метадах працы выступілі сакратар камітэта камсамола факультэта куратар В. А. Гайсёнак, член прафбюро, куратар В. М. Дрэко. Яны гаварылі аб сваім вопыце, а таксама прапагандавалі і абагульнялі работу лепшых куратараў факультэта, якімі з'яўляюцца Н. В. Гарашчук, Е. А. Мурашка, Н. М. Шумейка, А. В. Шыбаева і іншыя. Яны ўмеюць стварыць у групах абстаноўку высокай патрабавальнасці і прынцыповасці, непрымірымасці да недахопаў. Да іх ідуць студэнты з адкрытай душой, звяртаюцца па ўсіх пытаннях, якія хвалююць іх, і заўсёды атрымліваюць добрую параду і дапамогу. Невыпадкова, што яны карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод студэнтаў і выкладчыкаў.

Цікавым і карысным было выступленне супрацоўніцы сацыялагічнай лабараторыі БДУ Т. І. Гацукевіч. На падставе сацыялагічных даследаванняў у студэнцкіх групах яна гаварыла пра эфектыўнасць розных форм вучэбна-выхаваўчай работы.

Такім чынам, уся партыйная работа на фізфаку накіравана на дасягненне галоўнай мэты — паляпшэнне выхавання студэнтаў і падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**У. КУЛАЖАНКА.**

